МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

# МУЗЫКА

## I—IV класы

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2012

УДК 373.3.091.214:78
ББК 74.268.53
В90

ISBN 978-985-559-051-5

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2012
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі музыцы належыць асобая роля. Цэласна ўздзейнічаючы на асобу, музычнае мастацтва фарміруе светаадчуванне, светаўспрыманне і светапогляд маленькага чалавека.

***Мэта*** вывучэння прадмета «Музыка» — фарміраванне музычнай культуры асобы як часткі яе агульнай духоўнай культуры (Д. Б. Кабалеўскі). Дасягненне гэтай мэты магчымае толькі ў працэсе ўвядзення вучняў у музыку як у «мастацтва інтануемага сэнсу» (Б. У. Асаф'еў). Уваходжанне дзіцяці ў музыку не зводзіцца да засваення комплексу музычных ведаў, уменняў і навыкаў. Яно прадугледжвае фарміраванне ў вучняў каштоўнасных адносін да музыкі і жыцця, далучэнне да разнастайных спосабаў музычнай дзейнасці, раскрыццё творчага патэнцыялу асобы.

***Задачамі*** вучэбнага прадмета «Музыка» з'яўляюцца:

- выхаванне любові да музыкі;
- засваенне музычнага мастацтва шляхам авалодання музычнымі ведамі, слухацкімі і выканальніцкімі ўменнямі, набыццё вопыту самастойнай музычна-творчай дзейнасці;
- выхаванне эстэтычных адчуванняў і фарміраванне мастацкага густу;
- развіццё музычнага ўспрымання, мыслення, слыху, пеўчага голасу, творчых здольнасцей вучняў.

У аснове тэматычнай пабудовы праграмы ляжыць распрацаваная Д. Б. Кабалеўскім сістэма абагульненых уяўленняў аб музыцы як важнай частцы культуры грамадства і самакаштоўным відзе мастацтва. Тэматызм праграмы структураваны ў адпаведнасці з логікай развіцця музычнага мыслення і мастацкага ўспрымання вучняў.

Далучэнне да агульначалавечага духоўнага вопыту, адлюстраванага ў музыцы, адбываецца ў працэсе зносін вучняў з музычнымі творамі. У працэсе навучання вучні павінны не толькі практычна засвоіць інтанацыйную мову музыкі, але і набыць камунікатыўныя ўменні, якія дазваляюць уступаць у дыялог з мастацкім творам, аўтарам, эпохай.

Праграма арыентавана на паступовае назапашванне вучнямі вопыту музычна-мастацкай дзейнасці і яго наступнае абагульненне з дапамогай уводзімых музычных паняццяў. У сваю чаргу засваенне асноўных паняццяў і музычных тэрмінаў пастаянна павінна падмацоўвацца музычнай дзейнасцю вучняў.

Праграма прадугледжвае выкарыстанне розных відаў музычна-мастацкай дзейнасці. У сферу музычна-мастацкай дзейнасці вучняў уваходзяць слуханне, харавое і ансамблевае спяванне, ігра на музычных інструментах, пластычнае інтанаванне, сачыненне і імправізацыя, тэатралізацыя, рытмадэкламацыя і інш.

Мастацкі рэпертуар, прадстаўлены ў праграме, з'яўляецца прыкладным. Ён служыць арыенцірам для настаўніка ў рэпертуарнай аснашчанасці прадмета. Пры выкарыстанні рэпертуару неабходна кіравацца прынцыпам варыятыўнасці, які дазваляе наблізіць адукацыйны працэс да асобы настаўніка і асаблівасцей кожнага класа.

З мэтай фарміравання грамадзянскай культуры вучняў рэкамендуецца штогадовы зварот да «Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь»: у I—III класах — для слухання, у IV класе — для выканання. Пры падборы музычнага матэрыялу для азнаямлення вучняў з народнымі святамі мэтазгодна ўлічваць рэгіянальныя традыцыі.

У працэсе рэалізацыі праграмы мяркуецца шырокае выкарыстанне наступных метадаў:

- мастацкага, маральна-эстэтычнага пазнання музыкі;
- інтанацыйна-стылявога спасціжэння музыкі;
- перспектыўных і рэтраспектыўных сувязей;
- гульні;
- эмацыянальнай драматургіі;
- мастацкага кантэксту.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляецца ўрок. Урок музыкі ў дадзенай праграме трактуецца як урок мастацтва, для якога характэрная гнуткая структура

і наяўнасць эмацыянальна-сэнсавай драматургіі. У адпаведнасці з тэматычнай пабудовай вучэбнага матэрыялу выдзяляюцца наступныя тыпы ўрокаў:

- увядзення ў тэму;
- паглыблення і развіцця асобных аспектаў тэмы;
- абагульнення тэмы;
- кантролю засваення тэмы.

Прапанаванае ў праграме планаванне з'яўляецца прыкладным. Яно накіроўвае настаўніка на творчае канструяванне зместу кожнага ўрока. Пры планаванні важна ўлічваць скразны характар тэматычнага матэрыялу, набываемых вучнямі ведаў, уменняў і навыкаў.

У аснове праграмы ляжыць сістэма сувязей музычнага твора са «штодзённай» культурай, жыццёвым і мастацкім вопытам вучняў. Праграма дазваляе ажыццявіць пашырэнне мастацкай прасторы ўрока за кошт уключэння літаратурных твораў і твораў выяўленчага мастацтва, што садзейнічае фарміраванню пазнавальных інтарэсаў, развіццю асацыятыўна-вобразнага мыслення і творчых здольнасцей вучняў.

Праграма жорстка не рэгламентуе дзейнасць настаўніка, даючы яму прастору для творчасці. Педагагічная творчасць можа праяўляцца ў выбары і размеркаванні мастацкага матэрыялу, інтэрпрэтацыі той або іншай мастацкай ідэі, мастацка-драматургічным планаванні і ажыццяўленні вучэбнага працэсу цалкам.

# I КЛАС

**(34 гадзіны)**

I ЧВЭРЦЬ

**СВЕТ ГУКАЎ** (8 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб разнастайнасці гукавога свету прыроды і чалавека, разнастайнасці музычных інструментаў.

Фарміраванне ўменняў услухоўвацца ў з’явы навакольнага свету.

Фарміраванне элементарных выканальніцкіх уменняў.

### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Свет, што гучыць, вакол нас (1 гадзіна).
2. Прыродныя і механічныя гукі (1 гадзіна).
3. Музыка — краіна гукаў (1 гадзіна).
4. Карціны, створаныя пры дапамозе гукаў (2 гадзіны).
5. Настрой, перададзены пры дапамозе гукаў (2 гадзіны).
6. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н. Сакалоўскага*, сл. *М. Клімковіча* і *У. Карызны*.

«Ладу-ладу-ладкі», «Дождждык», «Іграў я на дудцы», «Белабока сарока». Беларускія народныя песні.

«Пачынаецца гульня», «Слова на далоньках», «Чараўнік Пінці Гру», «Як спяваеш?». Муз. *А. Паплянавай*, сл. *Н. Пікулевай*.

«Сонейка», «Дождджык». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *Л. Дымавай*.

«Што хочацца коніку». Муз. *Г. Пяцігорскага*, сл. *В. Луніна*.

*С. Пракоф'еў*. «Марш», «Дождж і вясёлка», «Казачка» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячая музыка»).

*Г. Вагнер*. «Зязюлька», «Песенька».

*С. Майкапар*. «Дождджык».

*Р. Шуман*. «Песенька жняцоў», «Паляўнічая песенька» (са зб. фартэпіянных п'ес «Альбом для юнацтва»).

*Э. Грыг*. «Птушачка».

*В. Гаўрылін*. «Раніца».

*Р. Гліэр*. «Вечар», «Раніца».

*А. Хачатуран*. «Вячэрняя казка».

*П. Падкавыраў*. «Свята ўраджаю», «Казка», «Ку-ку».

*Д. Шастаковіч*. «Катрынка».

«Казачок». Беларускі танцавальны найгрыш на скрыпцы.

«Полька». Беларускі танцавальны найгрыш на балалайцы.

«Кракавяк». Беларускі танцавальны найгрыш на гармоніку і бубне.

«Песня пра школу». Муз. *М. Драмлюгі*, сл. *Т. Масенкі*, рус. тэкст *Т. Волгінай*.

«Восень». Муз. *М. Красева*, сл. *М. Івенсэн*.

*Л. Мурашка*. «Сумная песня восеньскага лесу», «Вясёлы дождджык».

«У грыбы». Муз. *У. Алоўнікава*, сл. *М. Алтухова*.

## II ЧВЭРЦЬ

### **ЯК РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА** (8 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб выразнай мове музыкі.

Засваенне палітры сродкаў выразнага інтанавання, розных спосабаў адлюстравання вялікага і маленькага, высокага і нізкага, хуткага і павольнага, светлага і цёмнага, блізкага і далёкага.

### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Што і як можна расказаць пры дапамозе гукаў (1 гадзіна).
2. Гукаперайманне (1 гадзіна).
3. Святло і цень у музыцы (лад) (1 гадзіна).
4. Хуткае і павольнае ў музыцы (тэмп) (1 гадзіна).
5. Блізкае і далёкае ў музыцы (дынаміка) (1 гадзіна).
6. Халодная і цёплая музыка (тэмбр) (1 гадзіна).
7. Высокія і нізкія гукі (рэгістр) (1 гадзіна).
8. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Чубаценькі верабей», «Пайшоў коўзацца каток», «Гэй ты, воўчанька», «Каляда». Беларускія народныя песні.

Беларускія народныя танцы «Верабей», «Козачка».

«Что нам нравится зимой?». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *Л. Някрасавай*.

«Зімовая калыханка». Муз. *Л. Свердзеля*, сл. *В. Вярбы*.

«Добры жук». Муз. *А. Спадавекіа*, сл. *Я. Шварца*.

«Навагодняя». Муз. *А. Філіпенкі*, сл. *Г. Бойкі*, пер. з укр. *М. Івенсэн*.

«Танец каля ёлкі». Муз. *Ю. Слонава*, сл. *А. Міхайлавай*.

«Навагодняя карагодная». Муз. *А. Астроўскага*, сл. *Ю. Ляднёва*.

*Р. Шуман*. «Дзед Мароз», «Смелы коннік», «Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы» (са зб. фартэпіянных п'ес «Альбом для юнацтва»).

*Р. Сурус*. «Галоп», «Калыханка», «Жарты».

*К. Сен-Санс*. «Антылопы», «Куры і пеўні», «Акварыум», «Чарапаха» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

*К. Цесакоў*. «Гульня ў снежкі», «Снежны вальс».

*П. Чайкоўскі*. «Вальс снегавых камякоў» (з балета «Шчаўкунок»).

*С. Картэс*. «У некаторым царстве» (з Маленькай сюіты для фартэпіяна «Казка»).

*Ж. Ф. Рамо*. «Тамбурын».

«Здравствуй, зимушка-зима». Муз. *А. Філіпенкі*, сл. *Т. Волгінай*.

*Л. Мурашка*. «Вальс першых сняжынак».

«Бубенчыкі». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *Л. Дымавай*.
*І. Брамс*. «Пятрушка».
*А. Даргамыжскі*. «Танец Пятрушак».
«Песенька сяброў». Муз. *В. Герчык*, сл. *Я. Акіма*.
*Д. Кабалеўскі*. «Клоўны».
*В. Агафоннікаў*. «Сані са званочкамі».

## III ЧВЭРЦЬ

### З ЧАГО ВЫРАСЛА МУЗЫКА (9 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб першасных музычных жанрах — песні, танцы, маршы. Фарміраванне ўяўленняў аб выразным «пульсе» музыкі.

Фарміраванне ўменняў выконваць раўнамерны «пульс» у музыцы рознага характару, выдзяляць моцныя і слабыя долі «пульсу». Фарміраванне элементарных выканальніцкіх уменняў.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. З чаго пачынаецца музыка (1 гадзіна).
2. Песня, танец, марш (1 гадзіна).
3. Жывы «пульс» музыкі (1 гадзіна).
4. Якія бываюць маршы (1 гадзіна).
5. Якія бываюць танцы (2 гадзіны).
6. Песня ў жыцці чалавека (1 гадзіна).
7. Песня, танец, марш сустракаюцца ў адным музычным творы (1 гадзіна).
8. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

#### Прыкладны музычны матэрыял

«Ідзі, зіма, да Кракава». Беларуская вясновая песня.

«А на гары мак», «Многа нас, многа нас», «Сядзі, сядзі, Яшчур». Беларускія дзіцячыя гульні.

«У нашым класе» (марш, полька, вальс, песня). Муз. *Д. Кабалеўскага*.

«Калыханка». Муз. *В. Раінчыка*, сл. *Г. Бураўкіна*.

«Барабан». Муз. *Л. Сімаковіч*, сл. *Б. Жанчака*.

«Вясёлы музыкант». Муз. *А. Філіпенкі*, сл. *Т. Волгінай.*

«Поні», «Сонечныя зайчыкі», «Слон і скрыпачка». Муз. *А. Паплянавай*, сл. *В. Татарынава.*

«Мышка, мышка, дзе была?». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *Л. Пранчака.*

*Л. Бакерыні.* «Менуэт».

*П. Чайкоўскі.* «Песня жаваранка» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячы альбом»).

*С. Рахманінаў.* «Італьянская полька».

*Д. Шастаковіч.* «Вальс-жарт».

*Д. Кабалеўскі.* «Танец маладога бегемота», «Тры варыянты марша».

*С. Баневіч.* «Вальс на балі», «Паўночная полька» (з альбома «Па казках Ганса Хрысціяна Андэрсена»).

*С. Картэс.* «Прынц перамог дракона» (з Маленькай сюіты для фартэпіяна «Казка»).

*В. Кузняцоў.* «Вясёлы танец», «Марш», «Старадаўняя мелодыя».

*Л. Шлег.* «Марш», «Калыханка маці» (з сюіты-казкі «Пакаці-гарошак» для 4-струннай домры і фартэпіяна).

*Дж. Вердзі.* «Марш» (з оперы «Аіда»).

*Г. Гарэлава.* «Таўстун, што танцуе».

*К. Сен-Санс.* «Слон» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

*М. Мусаргскі.* «Гапак» (з оперы «Сарочынскі кірмаш»).

*С. Пракоф'еў.* «Марш».

*М. Глінка.* «Полька».

*С. Чарнецкі.* «Сустрэчны марш».

*М. Блантэр.* «Футбольны марш».

«Салдацік». Муз. *Г. Курына*, сл. *М. Карэма*, пер. *М. Кудзінава.*

«Пачынаем перапляс». Муз. *С. Сасніна*, сл. *П. Сіняўскага.*

«Тузік», «Калыханка». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *Л. Пранчака.*

«Мама». Муз. *Л. Бакалава*, сл. *С. Вігдарава.*

«Птушаняткі». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *Л. Дымавай.*

«Вясна». Нямецкая народная песня, рускі тэкст *С. Карагынай.*

*Л. Мурашка.* «Ігра ручайка».

## IV ЧВЭРЦЬ

### **ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА** (9 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб выразнасці і выяўленчасці ў музыцы.

Фарміраванне ўменняў адлюстроўваць кантрасныя настроі і з'явы навакольнага свету ў розных відах музычна-мастацкай дзейнасці.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Музычныя гісторыі, расказаныя кампазітарамі (1 гадзіна).
2. Музыка перадае адчуванні чалавека (2 гадзіны).
3. Музыка адлюстроўвае розныя рысы характару (1 гадзіна).
4. Музыка перадае рух (1 гадзіна).
5. Музыка малюе карціны (2 гадзіны).
6. Музыка народнага свята (1 гадзіна).
7. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

#### Прыкладны музычны матэрыял

«Камар лазню тапіў», «Іграў я на дудцы». Беларускія народныя песні.

«Узяў валынку наш сусед». Эстонская народная песня.

«Ідзі, ідзі, дождждык». Украінская народная песня.

«Розныя дзеці», «Мы крочым», «Першы клас» (папеўкі). Муз. *Д. Кабалеўскага.*

«Пастушок». Муз. *П. Падкавырава*, сл. *Я. Журбы.*

«Насарог». Муз. *І. Арсеева*, сл. *В. Віктарава.*

«Акліканне дажджу». Муз. *В. Сярых*, сл. народныя.

*Ф. Шуберт.* Экасез D-dur.

*І. С. Бах.* Прэлюдыя C-dur.

*П. Чайкоўскі.* «Хвароба лялькі», «Пахаванне лялькі», «Новая лялька» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячы альбом»).

*А. Залётнеў.* «Балет мышэй».

*В. Кузняцоў.* «Гульня ў класікі».

*Э. Грыг.* «Птушачка», «Матылёк».

*Ф. Шуберт.* «Пчолка».

*Д. Кабалеўскі.* «Труба і барабан», «Упарты брацік».

*В. Рэбікаў*. «Мядзведзь».
«Шчупак». Муз. *Л. Мурашкі*, сл. *Л. Пранчака.*
*А. Лядаў*. «Музычная табакерка», «Кікімара».
*У. Бёрд*. «Валынка», «Флейта і барабан».

### ПРЫКЛАДНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ МУЗЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ВУЧНЯЎ І КЛАСА

К канцу першага года навучання ў вучняў фарміруюцца першапачатковыя ў я ў л е н н і аб:
- разнастайнасці свету гукаў і музычных інструментаў;
- першасных жанрах музыкі;
- выразным «пульсе» музыкі;
- выразнасці і выяўленчасці ў музыцы.

Вучні павінны ў м е ц ь:
- выразна спяваць і музіцыраваць на музычных інструментах;
- выконваць раўнамерны «пульс» у музыцы рознага характару, выдзяляць моцныя і слабыя долі «пульсу»;
- выкарыстоўваць розныя спосабы адлюстравання вялікага і маленькага, высокага і нізкага, хуткага і павольнага, светлага і цёмнага, блізкага і далёкага ва ўласнай музычнай дзейнасці.

## II КЛАС

**(34 гадзіны)**

### І ПАЎГОДДЗЕ

### **СРОДКІ МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ** (16 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб сродках музычнай выразнасці.
Фарміраванне ўменняў выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці ва ўласнай музычнай дзейнасці.
Удасканаленне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання.

## Прыкладнае планаванне тэмы

1. Як кампазітары, выканаўцы і слухачы разумеюць адзін аднаго (1 гадзіна).

2. Мелодыя — каралева музыкі (1 гадзіна).

3. З чаго складаюцца мелодыі (1 гадзіна).

4. Рытм — залаты ключык музыкі (1 гадзіна).

5. Сям'я працягласцей (1 гадзіна).

6. Лад — згода, парадак паміж гукамі (2 гадзіны).

7. Тэмп у жыцці і ў музыцы (2 гадзіны).

8. Сіла гуку (дынамічныя адценні) (2 гадзіны).

9. Рэгістр — краіна гукаў: высокіх, сярэдніх і нізкіх (2 гадзіны).

10. Тэмбр — афарбоўка музычных галасоў (2 гадзіны).

11. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

## Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н. Сакалоўскага*, сл. *М. Клімковіча* і *У. Карызны.*

«Ляцелі гусёлкі», «Перапёлачка», «Запражыце сівых коней», «Грушка», «Каляда, каляда, дай, баба, пірага», «Ішла Каляда», «Люлі, люлі, цэлы дом спіць». Беларускія народныя песні.

«Песня пра Радзіму». Муз. і сл. *С. Галкінай.*

«Музыка». Муз. *С. Галкінай*, сл. *А. Кабец-Філімонавай.*

«Карункі восеньскія». Муз. і сл. *Я. Жабко.*

«Гукі музыкі». Муз. *Р. Роджэрса*, рускі тэкст *М. Цэйтлінай.*

«Куркі». Муз. *Л. Шлег*, сл. *А. Вольскага.*

«Родны бусел». Муз. *С. Галкінай*, сл. *Н. Галіноўскай.*

«Кракадзіл і Чабурашка». Муз. *І. Арсеева.*

«Дэльфіняня». Муз. *Э. Ханка*, сл. *В. Кручкова.*

«Карусель». Муз. *Д. Кабалеўскага*, сл. *І. Рахіло.*

«Спадарожная песня». Муз. *М. Глінкі*, сл. *М. Кукальніка.*

«Вясёлыя вандроўнікі». Муз. *М. Старакадомскага*, сл. *С. Міхалкова.*

«Гульня ў гасцей». Муз. *Д. Кабалеўскага*, сл. *І. Рахіло.*

«Фарэль». Муз. *Ф. Шуберта*, пер. *В. Кастамарава.*

«Сурок». Муз. *Л. ван Бетховена*, сл. *Н. Райскага.*

«Паветраная песня». Муз. *М. Старакадомскага*, сл. *Я. Далматоўскага.*

«Малінаўка». Муз. *Л. ван Бетховена*, сл. *Г. Бюргера.*

«Цымбалісты». Муз. *Ю. Семянякі*, сл. *Э. Агняцвет.*

«Музыканты». Муз. *Я. Рэмізоўскай*, сл. *Э. Агняцвет.*

«Зіма». Муз. *І. Лучанка*, сл. *Я. Коласа.*

«Песенька Дзеда-Барадзеда». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *А. Вольскага.*

«Батлеемска зорка». Муз. і сл. *Я. Петрашэвіча.*

*І. Жыновіч.* «Мелодыя».

*Л. Мурашка.* «Марш каляровых салдацікаў».

*В. Карэтнікаў.* «Маленькі каўбой».

*Д. Кабалеўскі.* «Зайчык дражніць медзведзяня».

*С. Майкапар.* «Рэха ў гарах».

*Б. Дварыёнас.* «Драўляны конік».

*В. Салманаў.* «Раніца ў лесе», «Вечар».

*П. Чайкоўскі.* «Марш драўляных салдацікаў» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячы альбом»).

*Э. Грыг.* «Танец эльфаў».

*С. Пракоф'еў.* Сімфанічная казка «Пеця і воўк».

*Л. ван Бетховен.* «Вясёлая. Сумная».

## II ПАЎГОДДЗЕ

### ПАДАРОЖЖА Ў МУЗЫЧНЫЯ КРАІНЫ — ОПЕРУ, БАЛЕТ, СІМФОНІЮ, КАНЦЭРТ (18 гадзін)

Фарміраванне першапачатковых уяўленняў аб оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце, аб элементах опернага і балетнага спектакляў, складзе сімфанічнага аркестра.

Фарміраванне ўменняў вызначаць па гучанні асобныя музычныя інструменты.

Удасканаленне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Песня, танец, марш завуць у падарожжа (1 гадзіна).
2. Музычнае падарожжа ў краіну Оперу (1 гадзіна).
3. Пра што расказваюць песня, танец, марш у оперы (2 гадзіны).
4. Музычнае падарожжа ў краіну Балет (1 гадзіна).

5. Пра што расказваюць танец, марш у балеце (2 гадзіны).
6. Як сяброуюць з музыкай іншыя віды мастацтва (1 гадзіна).
7. Падарожжа ў краіну Сімфонію (1 гадзіна).
8. Песня, танец, марш расказваюць без слоў (2 гадзіны).
9. Інструменты сімфанічнага аркестра (2 гадзіны).
10. Музычнае падарожжа ў краіну Канцэрт (1 гадзіна).
11. Музычнае спаборніцтва (2 гадзіны).
12. Куды прывялі нас песня, танец, марш (1 гадзіна).
13. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Саўка ды Грышка», «Кума мая, кумачка», «Стара бабуленька козліка мела», «Пайшоў Ясь наш на лужок», «Вясна-красна, а зіма хараша», «Чаму табе, Масленка, ды не сем нядзель?», «Вяснянка», «Чырвонае кока», «Ды была ў бабкі курка рабенька», «Памажы, Божа, нам вясну гукаць». Беларускія народныя песні.

«Журавель». Украінская народная песня.

«Уж как по мосту-мосточку». Руская народная песня.

«Студзень». Муз. *М. Наско*, сл. *А. Дзеружынскага.*

«Маленькая таполя». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *Л. Пранчака.*

«Шпак». Муз. *М. Анцава*, сл. *Я. Журбы.*

«Ліпка». Муз. *М. Красева*, сл. *П. Варанько*, пер. з укр. *С. Маршака.*

«Песенька пра маму». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *Л. Пранчака.*

«Хрыстос Васкрос». Муз. і сл. *Л. Кебіч.*

«Наша Перамога». Муз. *А. Чыркуна*, сл. *У. Карызны.*

«Наш край». Муз. *Д. Кабалеўскага*, сл. *А. Прышэльца.*

«Ля Вячы». Муз. *Э. Зарыцкага*, сл. *Л. Пранчака.*

«Кавалёк». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *Л. Пранчака.*

«Прекрасен мир поющий». Муз. *Л. Абелян*, сл. *В. Сцяпанава.*

*Р. Пукст.* «Дзіцячы танец і хор», «Полька» (з оперы «Марынка»).

*Я. Глебаў.* «Бульба» (з балета «Мара»).

*Я. Глебаў.* Адажыо з балета «Маленькі прынц».

*М. Чуркін.* Сімфаньета «Беларускія карцінкі», фінал.

*М. Коваль*. Фрагменты з оперы «Воўк і сямёра казлянят» (тэмы Малога, Балбатушкі, Усязнайкі, Таптушкі, Бадайкі. Калыханка Маці-казы, Два хоры казлянят, «Ваяўнічы марш», Фінал).

*Д. Кабалеўскі*. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам, ч. II.

*М. Красеў*. Заключны хор з оперы «Муха-цакатуха».

*М. Глінка*. Марш Чарнамора з оперы «Руслан і Людміла».

*М. Рымскі-Корсакаў*. «Тры цуды» (з оперы «Казка пра цара Салтана»).

*П. Чайкоўскі*. Сімфонія № 2, ч. IV.

*П. Чайкоўскі*. Хор сялян з оперы «Яўген Анегін».

*П. Чайкоўскі*. Неапалітанскі танец з балета «Лебядзінае возера».

*П. Чайкоўскі*. Марш з балета «Шчаўкунок».

*П. Чайкоўскі*. «Вальс» (з балета «Прыгажуня, якая спіць»).

*А. Глазуноў*. Сімфонія № 1, ч. II.

*С. Пракоф'еў*. «Вальс», «Поўнач» (з балета «Папялушка»).

*Ж. Бізэ*. Марш Тарэадора з оперы «Кармэн».

*В. А. Моцарт*. Каваціна Фігара з оперы «Вяселле Фігара».

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ МУЗЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

К канцу другога года навучання ў вучняў фарміруюцца першапачатковыя ў я ў л е н н і аб:

- оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце;
- групах інструментаў сімфанічнага аркестра;
- сродках музычнай выразнасці;
- сістэме працягласцей.

Вучні павінны ў м е ц ь:

- выразна спяваць і музіцыраваць на музычных інструментах;
- вызначаць па гучанні асобныя музычныя інструменты;
- асэнсавана выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці ва ўласнай музычнай дзейнасці.

# III КЛАС

**(35 гадзін)**

І ЧВЭРЦЬ

## ПЕСЕННЫ, ТАНЦАВАЛЬНЫ І МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ (8 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб песенным, танцавальным і маршавым характары музычнай мовы, аб выразных сродках песеннасці, танцавальнасці, маршавасці.

Удасканаленне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання.

### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы (1 гадзіна).
2. Песенны характар музычнай мовы (1 гадзіна).
3. Песеннасць у інструментальнай музыцы (1 гадзіна).
4. Танцавальны характар музычнай мовы (1 гадзіна).
5. Танцавальнасць у вакальнай і інструментальнай музыцы (1 гадзіна).
6. Маршавы характар музычнай мовы (1 гадзіна).
7. Маршавасць у вакальнай і інструментальнай музыцы (1 гадзіна).
8. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н. Сакалоўскага*, сл. *М. Клімковіча* і *У. Карызны.*

«Мікіта». Беларуская народная песня-танец.

«Дуб». Муз. *А. Чыркуна*, сл. *Я. Купалы.*

«Мы сябруем з музыкай». Муз. *Ё. Гайдна*, рускі тэкст *П. Сіняўскага.*

«Лясное свята». Муз. *Ж. Металідзі*, сл. *А. Фаткіна.*

«Заўжды ляці». Муз. *Я. Глебава*, сл. *П. Макаля.*

«Песенька сланяняці пра самога сябе». Муз. *А. Даньшовай*, сл. *А. Зарубіна.*

*В. Войцік.* «Пад старым дубам».

*Д. Лыбін.* «Правінцыяльная сімфонія», ч. III (фрагмент).

*Р. Пукст.* Арыя Марынкі з оперы «Марынка».

*П. Чайкоўскі.* Дуэт Машы і Прынца з балета «Шчаўкунок».

*Г. Гарэлава.* «Папяровая балерына», «Кароль з каралевай».

*М. Глінка.* Сімфанічная ўверцюра «Арагонская хота».

*Г. Вагнер.* «Крокі».

*А. Залётнеў.* «Уступ», «Песенька Каваля» (з оперы «Адчыніце, казлянияткі»).

*Я. Паплаўская.* «Восеньскі малюнак».

*Я. Глебаў.* Інтэрмедыя з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства».

*Ф. Шапэн.* Паланез A-dur.

*М. Глінка.* Паланэз з оперы «Іван Сусанін».

*А. Дворжак.* Славянскі танец № 8.

*Ж. Б. Люлі.* «Марш для турэцкай цырымоніі».

## II ЧВЭРЦЬ

### **ІНТАНАЦЫЯ** (8 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб інтанацыі як аб выразнасці маўлення і музыкі, «зерні», з якога вырастае музычны твор.

Фарміраванне ўменняў падбіраць і выконваць інтанацыі рознага характару на гукавышынных інструментах, ствараць выразныя і выяўленчыя інтанацыі ў розных відах музычна-мастацкай дзейнасці.

Удасканаленне ўменняў выразных спеваў і інструментальнага музіцыравання. Фарміраванне элементарных кампазітарскіх уменняў.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Выразнасць слова, музыкі, руху, колеру (1 гадзіна).
2. Блізкасць маўленчай і музычнай інтанацыі (1 гадзіна).
3. «Зерне»-інтанацыя (1 гадзіна).
4. Выразная інтанацыя (1 гадзіна).
5. Выяўленчая інтанацыя (1 гадзіна).

6. Выразная і выяўленчая інтанацыі сустракаюцца ў адным творы (2 гадзіны).

7. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Як пагнала бабуленька куранятак пасці», «Сеў жучок на сучок». Беларускія народныя песні.

«Зязюля». Швейцарская народная песня.

«В путь». Муз. *Ф. Шуберта*, сл. *В. Мюлера.*

«Вясёлая песенька», «Сумная песенька». Муз. *Г. Струвэ*, сл. *В. Віктарава.*

«Зіма». Муз. *Ц. Кюі*, сл. *Я. Баратынскага.*

«Навагодні карагод». Муз. *І. Лучанка*, сл. *В. Лучанок.*

«Кацяня і шчаня». Муз. *Т. Папаценкі*, сл. *В. Віктарава.*

*У. Кур’ян.* «Гадзіннік».

*А. Друкт.* «Гарэзлівыя прыпеўкі».

*Э. Тырманд.* «Дзве сяброўкі».

*М. Рымскі-Корсакаў.* «Палёт чмяля» (з оперы «Казка пра цара Салтана»).

*М. Рымскі-Корсакаў.* Тэма Астролага, Арыя Шамаханскай царыцы з оперы «Залаты пеўнік».

*Э. Грыг.* «Песня Сольвейг» (з музыкі да драмы «Пер Гюнт»).

*Л. К. Дакен.* «Зязюля».

*Б. Сметана.* «Влтава» (з сімфанічнай паэмы «Мая Радзіма»).

## III ЧВЭРЦЬ

### **РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ** (10 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб спосабах развіцця музыкі.

Фарміраванне ўменняў прасочваць тэмбравыя, дынамічныя, рэгістравыя, тэмпавыя, ладавыя змяненні ў музычным творы.

Фарміраванне ўменняў самастойна адбіраць сродкі музычнай выразнасці і складаць выканальніцкі план твора.

Фарміраванне ўмення прыдумваць інтанацыйны адказ у музычным дыялогу.

Удасканаленне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання. Фарміраванне элементарных кампазітарскіх уменняў.

### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Як расказваюць і слухаюць музычныя гісторыі (1 гадзіна).
2. Як развівае музыку кампазітар (1 гадзіна).
3. Меладыйнае развіццё музыкі (1 гадзіна).
4. Дынамічнае развіццё музыкі (1 гадзіна).
5. Тэмпавае развіццё музыкі (1 гадзіна).
6. Рэгістравае і тэмбравае развіццё музыкі (1 гадзіна).
7. Ладавае развіццё музыкі (1 гадзіна).
8. Выканальніцкае развіццё музыкі (1 гадзіна).
9. Музычныя дыялогі (1 гадзіна).
10. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Сядзіць камар на дубочку». Беларуская народная песня.

«Снегапад». Муз. *Ж. Металідзі*, сл. *Э. Фарджэн.*

«Чаму мядзведзь зімой спіць». Муз. *Л. Кніпера*, сл. *А. Каваленкава.*

«Песенька сонечных зайчыкаў». Муз. *В. Казеніна*, сл. *Ф. Лаўбе.*

«Как под мельницей». Муз. *М. Андрэевай*, сл. народныя.

«Цягнік». Муз. *М. Мятлова*, сл. *Т. Сікорскай.*

«Мядзведзь і камар». Муз. *А. Прасленева*, сл. *В. Шуміліна.*

«Улитка». Муз. *В. Кікты*, сл. *С. Сяровай.*

«Любая матуля». Муз. *А. Чыркуна*, сл. *Л. Пранчака.*

«Тень-тень, потетень». Муз. *В. Калінікава*, сл. народныя.

«Сараканожкі». Муз. *А. Даньшовай*, сл. *У. Арлова.*

*В. Карэтнікаў.* «У зімовым лесе» (з сюіты «Поры года»).

*Г. Гарэлава.* «Варона на слізкім даху».

*Я. Глебаў.* Фантазія на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка».

*Э. Грыг.* «Раніца», «У пячоры горнага караля» (з сюіты «Пер Гюнт»).

*Э. Грыг.* «Вясельны дзень у Трольхаўгене».

*Ф. Шуберт.* Вальс h-moll.

*В. А. Моцарт.* Дуэт Папагена і Папагены з оперы «Чароўная флейта».

*А. Вівальдзі.* «Бура на моры».

## IV ЧВЭРЦЬ

### БУДОВА (ФОРМЫ) МУЗЫКІ (9 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб элементах музычнай мовы, аб музычных формах: аднача сткавых, двухчасткавых, трохчасткавых, ронда і варыяцыях.

Фарміраванне ўменняў вызначаць і адлюстроўваць рознымі спосабамі будову музычных твораў.

Удасканаленне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання. Фарміраванне элементарных кампазітарскіх уменняў.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Разнастайнасць будовы музычных твораў (1 гадзіна).
2. Кантрасты і паўторы ў жыцці і музыцы (1 гадзіна).
3. З чаго складаецца музычная мова (1 гадзіна).
4. Як музыка расказвае гісторыі, у якіх няма кантрастаў (1 гадзіна).
5. Двухчасткавая форма (1 гадзіна).
6. Трохчасткавая форма (1 гадзіна).
7. Ронда (1 гадзіна).
8. Варыяцыі (1 гадзіна).
9. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

#### Прыкладны музычны матэрыял

«Карагодны». Беларускі народны танец.

«А мы грушу пасадзілі», «Пад калінаю, пад малінаю», «На лугу, на лугу зелянёшанькім». Беларускія народныя песні.

«Кума мая, кумачка». Беларуская народная песня ў апр. *В. Сярых*.

«Кума мая, кумачка». Беларуская народная песня ў апр. *Ё Хаазена* для карыльёна.

«Цёплыя дзянёчкі». Муз. *М. Літвіна*, сл. *Л. Пранчака.*

«Хованкі». Муз. *А. Думчанкі*, сл. *А. Кушнера.*

«Дабрыня». Муз. *І. Лучанка*, сл. *Н. Тулупавай.*

«Вясёлыя медзведзяняты». Муз. *А. Паплянавай*, сл. *Н. Пікулевай.*

«Балбатуха». Муз. *С. Пракоф'ева*, сл. *А. Барто.*

«Зачем нам выстроили дом?». Муз. *Д. Кабалеўскага*, сл. *В. Віктарава.*

*А. Літвіноўскі.* «Вячэрнія аблокі».

*В. Карэтнікаў.* «Летнім вечарам» (з сюіты «Поры года»).

*П. Чайкоўскі.* «Італьянская песенька», «Баба-Яга» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячы альбом»).

*М. Глінка.* Сімфанічная ўверцюра «Камарынская».

*Ф. Шапэн.* Прэлюдыя № 7.

*Э. Грыг.* «Танец Анітры» (з сюіты «Пер Гюнт»).

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ МУЗЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

К канцу трэцяга года навучання ў вучняў фарміруюцца ў я ў л е н н і аб:

- выразных сродках песеннай, танцавальнай і маршавай музычнай мовы;
- інтанацыі як выразнасці слова, гуку, руху, колеру;
- інтанацыі як «зерні», з якога вырастае музычны твор;
- спосабах развіцця музыкі;
- элементах музычнай мовы;
- музычных формах (двухчасткавая кантрастная, трохчасткавая рэпрызная, ронда, варыяцыі).

Вучні павінны ў м е ц ь:

- выразна спяваць і музіцыраваць на музычных інструментах;
- падбіраць і выконваць інтанацыі рознага характару на гукавышынных інструментах, ствараць выразныя і выяўленчыя інтанацыі ў розных відах музычна-мастацкай дзейнасці;
- прыдумваць інтанацыйны адказ у музычным дыялогу;

- прасочваць тэмбравыя, дынамічныя, рэгістравыя, тэмпавыя, ладавыя змяненні ў музычным творы;
- самастойна адбіраць сродкі музычнай выразнасці і складаць выканальніцкі план твора;
- адлюстроўваць рознымі спосабамі будову музычных твораў.

# IV КЛАС

**(35 гадзін)**

## І ПАЎГОДДЗЕ

### МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (16 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб жанравай разнастайнасці беларускай музыкі, аб сувязі народнай і кампазітарскай музыкі, аб адлюстраванні ў музыцы гісторыі і розных бакоў жыцця беларускага народа.

Фарміраванне ўяўленняў аб творчасці беларускіх кампазітараў і выканальніцкім мастацтве Беларусі.

Удасканаленне выканальніцкіх, слухацкіх і кампазітарскіх уменняў.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Музыка — люстэрка жыцця і душа народа (1 гадзіна).
2. Нараджэнне і жыццё народнай песні (2 гадзіны).
3. Восеньскія песні (1 гадзіна).
4. Музычныя казкі беларускага народа (1 гадзіна).
5. Музычныя гульні беларускага народа (1 гадзіна).
6. Беларускія музычныя інструменты (2 гадзіны).
7. Танцавальная культура майго народа (2 гадзіны).
8. Музыка расказвае пра мінулае нашай Радзімы (2 гадзіны).
9. Музыка ў царкве і касцёле (2 гадзіны).

10. Музыка ў народных абрадах і святах («Каляды») (1 гадзіна).

11. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н. Сакалоўскага*, сл. *М. Клімковіча* і *У. Карызны*.

«А ў нашага пана дажыначкі рана», «Ой, мамачка, восень», «Чаго ты, лосю, чаго ты, дзікі», «На Дунаёчку», «У нас сягоння дажыначкі», «Вецярок вее, жыта палавее», «Ярная», «Дубровушка ды зялёная». Беларускія народныя песні.

«Ой, калядачкі, вы вярніцеся», «Прыехала Каляда ўвечары», «А ў заінькі тры думухны», «Го-го-го, каза», «Ой, рана-рана куры запелі», «Бегла Калядка пешкам-пешкам». Беларускія народныя песні.

«Бачыць маё вочка», «Ох, і сеяла Ульяніца лянок», «Сіўкаваронка», «Як паставіў верабейка на сметнічку хатку», «Зайграй жа мне, дударочку». Беларускія народныя песні.

«Ішоў казёл». Беларуская народная песня ў апр. *У. Прохарава.*

«Юрачка», «Мікіта», «Янка-полька», «Крыжачок», «Бульбаполька», «Мяцельца», «Кадрыля». Беларускія народныя танцы.

«Радзіма, мая дарагая». Муз. *У. Алоўнікава*, сл. *А. Бачылы.*

«Наша Радзіма». Муз. *А. Безенсон*, сл. *Л. Глінскай.*

«Завешся ты ласкава Белай Руссю». Муз. *Л. Захлеўнага*, сл. *В. Лучанок.*

Вітанне Нацыянальнага акадэмічнага народнага хора Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча (на аснове вясельнай народнай песні «Частуйцеся, госці»).

«Цымбалы». *Муз. В. Воінскай*, сл. *І. Цітаўца.*

«Гудчык». Муз. *І. Лучанка*, сл. *К. Маркса.*

«Мірскі замак». Муз. *В. Кісценя*, сл. *І. Цітаўца.*

«Пришла зима с морозами». Муз. *В. Войціка*, сл. *В. Высотскай.*

«Ціхая ноч». Муз. *Ф. Грубера*, сл. *Ё. Мора.*

«Што прыносіць Новы год?». Муз. *А. Безенсон*, сл. *Л. Дайнекі.*

«Жураўлі на Палессе ляцяць». Муз. *І. Лучанка*, сл. *А. Ставера.*

«Явар і каліна». Муз. *Ю. Семянякі*, сл. *Я. Купалы.*

*І. Жыновіч.* «Беларускія танцы».

*В. Карэтнікаў.* «Адлятаюць птушкі» (з сюіты «Поры года»).

*С. Картэс.* «Танец феі».

*В. Войцік.* «Песенька сяброў», «Лічылка» (з мюзікла «Прыгоды ў замку Алфавіт»).

*В. Войцік.* «Забавы».

*Д. Лыбін.* «Неўрачысты выхад праз негалоўную браму» (з цыкла «Музыка для горада Нясвіжа»).

*У. Кур'ян.* Танец прыгажунь са спектакля «Ідылія».

«Полацкі сшытак» (фрагменты на выбар настаўніка).

*М. К. Агінскі.* Паланэзы a-moll, F-dur.

«Нова радость стала», «Скиния златая», «Дар ныне пребогатый». Духоўныя канты ў апр. *Л. Шлег.*

*Л. Шлег.* «Ave Maria».

*У. Алоўнікаў.* Сімфанічная паэма «Партызанская быль».

*А. Багатыроў.* Арыя Апанаса з оперы «У пушчах Палесся».

*Я. Глебаў.* Тарантэла з балета «Альпійская балада».

*Я. Глебаў.* «Ноч у Парыжы», «Гавот» (з музыкі да п'есы «Тры мушкецёры»).

## II ПАЎГОДДЗЕ

### **МУЗЫЧНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ** (19 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як мове чалавечых зносін. Фарміраванне ўяўленняў аб разнастайнасці музычных моў народаў свету. Выяўленне інтэрнацыянальных сувязей у творчасці кампазітараў і выканаўцаў.

Фарміраванне камунікатыўных музычных уменняў. Удасканаленне выканальніцкіх, слухацкіх і кампазітарскіх уменняў.

#### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Музыка — мова сяброўства і ўзаемаразумення паміж народамі (1 гадзіна).

2. Музыка нашых суседзяў — рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў (4 гадзіны).

3. Музыка ў народных абрадах і святах («Масленка», «Гуканне вясны», «Саракі») (2 гадзіны).

4. Музычнае падарожжа па Еўропе (2 гадзіны).

5. Дзівосныя інтанацыі ўсходняй музыкі (2 гадзіны).

6. Узоры афрыканскіх рытмаў (1 гадзіна).

7. Музыка Амерыкі (2 гадзіны).

8. Цуд калыханкі (1 гадзіна).

9. Музыка народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь (2 гадзіны).

10. Музыка ў народных абрадах і святах («Купалле») (1 гадзіна).

11. Абагульняючы ўрок (1 гадзіна).

### Прыкладны музычны матэрыял

«Спі, сыночак міленькі». Беларуская народная песня.

«А сёння ў нас Масленка», «На вуліцы Масленіца», «А на гарэ сонца», «На вуліцы дзеўкі гулялі». Беларускія народныя песні.

«Агу, вясна, агу, красна», «Вясна-красна», «Песенька мая харошая», «Ой, вясна, вясна, вясеначка», «Гаспадарочак, слаўны паночак», «Жавароначкі, прыляціце». Беларускія народныя песні.

«У нас сёння Купалачка», «На святога Яна дзеўкі зелле рвалі», «Шла Купалка па вуліцы», «Купалінка», «Цяпер Купала, а заўтра Ян», «Ой, рана на Йвана». Беларускія народныя песні.

«Хава». Традыцыйны яўрэйскі танец.

Татарскія танцавальныя прыпеўкі.

«Шчэдрык». Украінская народная песня.

«Сонейка ўставала», «Песціў канька я». Літоўскія народныя песні.

«У Авіньёне на мосце», «Пастухова песня». Французскія народныя песні.

«О маё сонца». Італьянская народная песня.

«Сіяхамба». Традыцыйная афрыканская песня.

Цырыманіяльныя святочныя танцы ў кенійскай вёсцы.

«Мазурка». Традыцыйны польскі танец.

«Вниз по матушке, по Волге». Руская народная песня.

«Рамонка». Муз. *І. Лучанка*, сл. *А. Вольскага.*

«Мая Расія». Муз. *Г. Струвэ*, сл. *Н. Салаўёвай.*

«Ослик мой, быстрей шагай». Муз. *В. Дамарацкага*, сл. народныя, пер. з фр. *Н. Гернет* і *С. Гіпіус*.

«Б'юць тамтамы». Муз. *Г. Струвэ*, сл. *А. Барто*.

«Джаз». Муз. *Я. Дубравіна*, сл. *В. Суслава*.

«Птушкі над узмор'ем». Муз. *Х. Ратара*, сл. *К. Тарыякі*.

«Мы ідзем гукаць вясну». Муз. *В. Сярых*, сл. *І. Цітаўца*.

«Мы з табой ішлі?». Муз. *В. Войціка*, сл. *Л. Пранчака*.

«Кураняты». Муз. *Г. Гусейнлі*, сл. *Т. Муталібава*.

«Хлопчык і цвыркун». Муз. *Р. Паўлса*, сл. *Аспазіі*.

«Заход сонца». Муз. *Э. Грыга*, сл. *А. Мунка*, пер. *С. Свірыдзенкі*.

*Н. Сакалоўскі*. «Мазурка».

*Д. Лыбін*. «Джаз, які заблудзіў», «Дом з прывідам».

*С. Бельцюкоў*. «Гарадскі пейзаж», «Вечар» (з сюіты «Кітайскія акварэлі» для ўдарных інструментаў).

*М. Чуркін*. «Калыханка».

«Глыбокая рака». Спірычуэл.

*А. Ціпет*. «Спірычуэл».

*Дж. Гершвін*. Калыханка з оперы «Поргі і Бэс».

*Н. Паганіні*. «Кампанела».

*Н. Паганіні—Ф. Ліст*. «Кампанела».

*В. А. Моцарт*. Сімфонія № 40, ч. І, экспазіцыя.

*А. Вівальдзі*. «Поры года» (на выбар настаўніка).

*М. К. Чурлёніс*. Сімфанічная паэма «У лесе».

*С. Рахманінаў*. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам № 3, ч. І, Галоўная партыя.

*Г. Свірыдаў*. «Зімовая дарога» (з музычных ілюстрацый да аповесці А. С. Пушкіна «Мяцеліца»).

*Ф. Шапэн*. Накцюрны E-dur, cis-moll.

*І. Штраус*. Марш Радзецкага, Полька-піцыката.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ МУЗЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Музычная культура вучняў канкрэтызуецца ў наступных уяўленнях аб:

- жанравай разнастайнасці беларускай музыкі, глыбокай сувязі народнай і кампазітарскай творчасці;
- музыцы ў народных абрадах і святах у Беларусі;

- разнастайнасці музычных моў, агульных і спецыфічных рысах у музыцы розных народаў;
- інтэрнацыянальных сувязях у творчасці кампазітараў і выканаўцаў.

Музычная культура выпускнікоў пачатковай школы выяўляецца ў наступных у м е н н я х:

- параўноўваць змест, жанры, формы музычных твораў у музыцы розных народаў;
- прасочваць развіццё музыкі, адлюстроўваць рознымі спосабамі будову музычных твораў;
- выказваць свае адносіны да музыкі;
- выразна спяваць і музіцыраваць на музычных інструментах;
- асэнсавана выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці ў розных відах музычнай дзейнасці.

## ЛІТАРАТУРА

### Для настаўніка

*Абдуллин, Э. Б.* Теория и практика музыкального обучения в общеобразовательной школе: пособие для учителя / Э. Б. Абдуллин. — М.: Просвещение, 1983.

*Антоневич, В. А.* Белорусская музыка XX века: Композиторское творчество и фольклор / В. А. Антоневич. — Минск: БГАМ, 2003.

*Апраксина, О. А.* Методика развития детского голоса: учеб. пособие / О. А. Апраксина. — М., 1983.

Беларускія народныя абрады / склад. Л. П. Касцюкавец. — Мінск: Беларусь, 1994.

*Вендрова, Т. Е.* Пусть музыка звучит: кн. для учителя. Из опыта работы / Т. Е. Вендрова. — М.: Просвещение, 1990.

*Вількін, Я. Р.* Беларускія народныя гульні / Я. Р. Вількін. — Мінск: Беларусь, 1996.

Восеньскія святы: дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / укл. А. Ю. Лозка. — Мінск: Беларусь, 1995.

*Горюнова, Л. В.* Урок музыки — урок искусства: кн. для учителя / Л. В. Горюнова, Л. П. Маслова. — М.: Прометей, 1989.

*Гришанович, Н. Н.* Музыка в школе: метод. пособие для учителей учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования, с 12-летним сроком обучения / Н. Н. Гришанович. — Минск: Юнипресс, 2006.

Дзіцячыя фальклорныя гульні / аўт.-уклад. З. П. Леановіч, Н. А. Рылькова. — Мінск: Народная асвета, 1995.

*Дмитриева, Л. Г.* Методика музыкального воспитания в школе / Л. Г. Дмитриева, Н. М. Черноиваненко. — М.: Академия, 2000.

*Кабалевский, Д. Б.* Как рассказывать детям о музыке? / Д. Б. Кабалевский. — М.: Просвещение, 1989.

*Кабалевский, Д. Б.* Сила искусства / Д. Б. Кабалевский. — М.: Молодая гвардия, 1984.

Калыханкі і забаўлянкі / уклад. В. Ліцвінка. — Мінск: Рэсп. цэнтр эстэтыч. выхавання дзяцей, 1992.

*Королева, Т. П.* Методическая подготовка учителя музыки: Педагогическое моделирование / Т. П. Королева. — Минск: Технопринт, 2003.

Летнія святы: дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / А. Ю. Лозка. — Мінск: Беларусь, 2001.

*Ліцвінка, В.* Святы і абрады беларусаў / В. Ліцвінка. — Мінск: Беларусь, 1998.

Музыка в начальных классах: метод. пособие для учителя. — М.: Просвещение, 1985.

Музыкальное образование в школе / под ред. Л. В. Школяр. — М.: ACADEMIA, 2001.

Музыкальный словарь Гроува / пер. с англ., ред. и доп. Л. О. Акопяна. — М.: Изд. дом «Практика», 2001.

*Рева, В. П.* Восприятие музыки школьниками: в 2 ч.: пособие для учителей / В. П. Рева. — М.: Беларусь, 2000. — Ч. I.

*Цитович, Г. И.* О белорусском песенном фольклоре / Г. И. Цитович. — Минск: Беларусь, 1976.

Элементарное музыкальное воспитание по системе Карла Орфа / сост. Л. А. Баренбойм. — М.: Советский композитор, 1978.

*Юркевіч, В. Д.* Дыдактычныя музычныя гульні і практыкаванні: метад. дапам. / В. Д. Юркевіч. — Мінск: Элджернон, 1995.

## Для вучняў

*Кабалевский, Д. Б.* Про трех «китов» и про многое другое: кн. о музыке / Д. Б. Кабалевский. — М.: Детская литература, 1972.

*Лаевский, С.* Маленькие истории из жизни великих композиторов / С. Лаевский. — СПб.: Союз художников, 2003.

*Михеева, Л. В.* Музыкальный словарь в рассказах / Л. В. Михеева. — М.: Советский композитор, 1984.

Музыкальные инструменты мира / пер. с англ. Т. В. Лихач. — Минск: Попурри, 2001.

Музыка-чарадзей / уклад. А. І. Гурскі. — Мінск: Юнацтва, 1995.

*Сабатье, К.* Музыкальные инструменты / К. Сабатье. — М.: Астрель : АСТ, 2002.

*Стронг, Д.* Ударные инструменты для «чайников» / Д. Стронг. — М.: Диалектика : Вильямс, 2007.

Энциклопедический словарь юного музыканта / сост. В. В. Медушевский, О. О. Очаковская. — М.: Педагогика, 1985.

*Юдина, Е. И.* Мой первый учебник по музыке и творчеству. Азбука музыкально-творческого саморазвития / Е. И. Юдина. — М.: Аквариум, 1997.

ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска ........................................ 3

**I клас** ........................................ 6

**II клас** ........................................ 12

**III клас** ........................................ 17

**IV клас** ........................................ 23

Літаратура ........................................ 29

Вучэбнае выданне

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

# МУЗЫКА

**I—IV класы**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. В. Дземід*
Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейкі*
Карэктар *К. В. Шобік*

Падпісана ў друк 27.03.2012. Фармат 60×84/16.
Папера газетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,86.
Ул.-выд. арк. 1,05. Тыраж 3250 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494469 ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"». ЛП № 02330/327 ад 19.01.2012.
Вул. Захарава, 59, 220088, г. Мінск